Таким образом, учебные дисциплины филологического профиля обладают значительным потенциалом в формировании значимых профессиональных, личностных и психологических качеств будущего врача. Использование воспитательного потенциала учебных дисциплин требует от преподавателя достаточной педагогической и методической подготовки для осуществления тщательного отбора дидактического материала, формулирования заданий воспитательной направленности, моделирования речевой деятельности обучающихся в рамках преподаваемых дисциплин лингвистического модуля. При этом пример преподавателя, демонстрирующего лучшие профессиональные и личностные качества представителя своего учреждения образования, имеет огромное значение в процессе реализации воспитательных задач посредством преподаваемых учебных дисциплин.

Литература:

1. Миронова, Т. Н. Воспитательный потенциал профессиональных дисциплин в вузе / Т. Н. Миронова // Научные труды Московского гуманитарного университета. – 2023. – № 2. – С. 23–31 (DOI: https://www.doi.org/10.17805/trudy.2023.2.3).
2. Любова, Т. В. Воспитательный потенциал дисциплины «Иностранный язык» в формировании межкультурной компетенции студентов неязыковых направлений подготовки / Т. В. Любова, О. Г. Евграфова // Филологические науки. Вопросы теории и практики. – Тамбов : Грамота. – 2016. – № 4 (58). – Ч. 3. – С. 119–203.

# ВЫТОКІ ЛАЦІНАМОЎНАЙ ПАЭЗІІ М. КАРЫЦКАГА

**Шарова І. В.**

Гродзенскі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт
г. Гродна, Рэспубліка Беларусь

Лацінская мова не была заўсёды мёртвай мовай, як гэта сцвярджаюць некаторыя скептыкі, а лацінская літаратура не была мёртвай літаратурай. На гэтай мове не толькі пісалі, але і гаварылі, што цалкам натуральна, паколькі лаціна ў тагачаснай Еўропе ўважалася за мову навукі і культуры. У эпоху Сярэднявечча і Рэнесансу яна яднала вучоных розных краін, з’яўлялася сродкам стварэння адзінай еўрапейскай культуры.

Характэрнай асаблівасцю зараджэння беларускай паэзіі ў пачатку XVI стагоддзя з’яўляецца шырокае бытаванне вершаваных твораў на лацінскай мове. Яны станоўча паўплывалі на развіццё такіх жанраў, як панегірык, паэма, пасланне, элегія і на першапачатковым этапе адыгралі прыкметную ролю ў кансалідацыі літаратурных сіл, у выхаванні чытацкай аўдыторыі. Пачынальнікамі беларускай лацінамоўнай паэзіі былі С. Будны, С. Рысінскі, М. Гусоўскі, Я. Вісліцкі і М. Карыцкі, якія горда працягнуў справу сваіх папярэднікаў.

Репозиторий ГрГМУ

М. Карыцкі «адносіўся да тых, хто, творачы на лацінскай мове, чэрпаючы са скарбніц старажытнарымскай пісьменнасці, адчуваў поўнае задавальненне; ён захапляўся гучнасцю і вобразнасцю латыні, бачыў у ёй непераўзыдзены сродак літаратурнага тварэння» [1, с. 63]. Ён атрымаў выключную адукацыю, працаваў настаўнікам, дырэктарам школы ў многіх гарадах Беларусі, апошняя ягоная пасада – рэктар мінскай ваяводскай школы. Па загадзе караля Станіслава Аўгуста Панятоўскага, які добра ведаў літаратуру, яму была прысуджана прэстыжная ганаровая медаль «Merentibus» (заслужаным). Уся яго біяграфія, запісы экзаменатараў у акадэміях Вільні і Варшавы сведчаць аб тым, што Карыцкі меў незвычайныя здольнасці да навукі, талент прамоўцы і прапаведніка. З 1730 года ён звязвае сваё жыццё з ордэнам езуітаў, а пасля яго распаду перажывае духоўны крызіс. З ордэнам яго ядналі надзеі на лепшае жыццё, на ўстанаўленне справядлівасці і парадку ў дзяржаве, бо паэт бачыў разбэшчанасць двара, засілле немцаў. Выкрываючы зло, ён прадоўжыў традыцыі ананімнай сатырычнай беларускай літаратуры XVII стагоддзя, яе выдатнага помніка як «Прамова Мялешкі».

У «Элегіі каралеўскаму сакратару Антону Касакоўскаму» Карыцкі з непадробнай горыччу і адчаем смуткуе з прычыны ліквідацыі ордэна:

Вось скажы мне, Антон, не хавай, прашу, сваіх думак,
Болю прычына майго верная, ці не, была?
Што заставалася мне рабіць, закранутаму гэтай бядою?
Плач – вось адзіная праца, – змоўкнуць і цяжка ўздыхаць [1, с. 59].

Значны ўплыў на ягоную творчасць зрабілі антычныя байкапісцы Эзоп і Федр, а магчыма, і французскі байкапісец XVIII ст. Жан Лафантэн. Карыцкі працуе над творамі, якія ў алегарычнай форме рэзка кляймуюць парокі грамадства, яго недасканаласць і падказваюць іх шляхі пераадолення. Гэта такія творы. як «Казка», «Ападосіс», «Птушыны сейм». Паэт праўдзіва і жыццёва апісвае бедствы, што спасцглі Польшчу ў канцы XVII – пачатку XVIII ст. і працягваюцца цяпер – разлад, міжусобіцы, праследаванні, самавольства ўлад, – і ўсклаў усе свае спадзяванні на новаабранага караля Станіслава Аўгуста Панятоўскага.

М. Карыцкі дасканала валодаў і польскай мовай, але лацінская аказалася яму бліжэй: «З 6000 радкоў паэтычнай спадчыны Карыцкага толькі 221 напісаны на польскай мове, у іх ліку 138 прадстаўлены паралельна на лацінскай і польскай мовах. Толькі 87 радкоў не маюць у тэкстах Карыцкага лацінскіх адпаведнасцяў» [1, с. 63].

Прыжыццёва было выдадзена 25 вершаў М. Карыцкага, апублікаваных у зборніках і асобнымі выданнямі. Таму, будучы на пенсіі, ён натхнёна рыхтаваў да друку зборнік сваіх вершаў і незадоўга да смерці пераслаў яго ў Полацкую акадэмію. Там ён быў упарадкаваны і выдадзены пад назваю «Carmina» (Песні) у 1817 годзе і налічваў 155 старонак. Сюды ўвайшлі эпіка-панегірычныя творы, элегіі, оды, эпіграмы, эпітафіі.

Творчая дзейнасць М. Карыцкага пачалася на мяжы дзвюх эпох – Контррэфармацыі і Асветніцтва. Грамадска-палітычныя ідэі гэтых эпох паўплывалі на эстэтычную канцэпцыю пісьменніка. Наглядным прыкладам



Репозиторий ГрГМУ

можа служыць алегарычны верш «Да аднаго паэта». Мастацтва паэт падае ў вобразе кветкі. Ён лічыць, што прырода і мастацтва (кветка), не сфармаваныя паводле законаў хараства і розуму (аздоба кветкі), былі б мёртвыя, адсюль і выснова: мастак павінен уважліва сузіраць прыроду, браць з яе «будаўнічае рэчыва» для сваіх твораў (у Карыцкага – «сок кветкі»), наследаваць ёй. Ніхто не чакае плёну ад гнілой кветкі [2, с. 313-314]. Карыцкі патрабуе ад іншых паэтаў быць вернымі жыццёвай праўдзе, заклікае іх да карпатлівай работы над вершам. У гэтым плане паэт працягвае традыцыю М. Гусоўскага, выказаную ім у «Песні пра зубра»: «Я прысягаю: заўжды, да апошняга слова пець толькі праўду». У сувязі з гэтай канцэпцыяй, як адзначаюць многія даследчыкі, у творчасці М. Карыцкага яскрава выявілася непарыўная сувязь са сваёй Радзімай, родная зямлёю. У яго вершах распрацоўваецца пераважна мясцовая беларуская тэматыка: «Пажар у Вішневе», «Вяртанне князя Радзівіла з-за мяжы ў Нясвіж», «Феерверк у Шклове з нагоды прыезду Кацярыны II», «Радасць у Полацку з нагоды прыбыцця Кацярыны II», «Смутак у Полацку з прычыны ад'езду Кацярыны II». Паэт узвялічвае міратворчую палітыку рускай імперыятрыцы, якая патушыла, па яго разуменню, пажар вайны ў Заходняй Еўропе: «Уяўленне паэта малюе цудоўныя перспектывы росквіту навукі, мастацтва і будаўніцтва ў Расіі і Беларусі, абумоўленага мірнай стваральнай працай таленавітага народа», – піша Парэцкі [1, с. 61].

Паэт шчыра захапляецца хараством беларускай прыроды. У яго вершах жывуць, як пераканаўча даводзяць многія даследчыкі, элементы сентыменталізму і нават першыя адзнакі прадрамантызму. У адрозненне ад многіх паэтаў-пантэістаў Карыцкі вельмі не любіць зімы. Верш «Праклёны зіме» зводзіцца да высновы, што «настане пасля непагодзі і нягод час, калі чалавек зможа бесклапотна прадаўжаць жыццёвы шлях, радуючыся прыгажосці прыроды» [1, с. 47]. У вершы «Ода госцю Людовіку ў пачатку мая» радасны, прыўзняты вясенні настрой прыходзіць на змену ненавіснай зімовай сцюжы. Прырода Беларусі сваёй захапляючай прыгажосцю гасцінна сустракае іншаземцаў.

Крыніцы творчасці М. Карыцкага мы бачым не толькі ў самой прыродзе рэчаў, але і ў наследаванні ўзорнай на той час антычнай літаратуры, дзе «найбольш увасобіліся універсальныя прынцыпы і законы прыроды. Аднак, трымаючыся канонаў класіцызму, Карыцкі ніколі слепа не пераймаў антычных паэтаў» [3, с. 174]. Ідэі класіцызму несумненна паўплывалі на станаўленне творчай індывідуальнасці паэта. Класіцыстаў, як вядома, хвалявалі карэнныя праблемы сацыяльнага і палітычнага жыцця дзяржавы. Сярод іх – праблема ўлады і крытыка дваранства. Такія ж грамадзянскія матывы мы знаходзім у вершах і паэмах М. Карыцкага, дзе ён адстойвае моцную каралеўскую ўладу, якая спыніць бяздумную антынародную палітыку магнатаў, іх разбэшчанасць і ўсобіцы. Нават асабістыя і інтымна-лірычныя матывы ў духу класіцызму знаходзяцца дзесьці на заднім плане, бо канцэпцыя сентыменталізму паўплывала на яго менш. У творчасці М. Карыцкага адчуваюцца водгукі барочнай паэзіі: чалавек слабы і абмежаваны ў параўнанні з усемагутным Богам



Репозиторий ГрГМУ

і поўнасцю залежыць ад волі вышэйшых сіл (вершы ў абарону ордэна езуітаў, гімны святым, услаўленне рэлігійных святаў).

Несумненна, што на творчасць Карыцкага паўплывалі асветніцкія ідэі ягонага суайчынніка Сімяона Полацкага: абодва ўслаўлялі Расію і яе манархаў, абодва бачылі выйсце з бяздзейнага становішча ў моцнай уладзе, абодва ўслаўлялі навуку і садзейнічалі павышэнню ролі адукацыі і выхавання ў жыцці краіны.

Такім чынам, лацінамоўная паэзія Беларусі фармавалася пад уплывам прагрэсіўных навуковых ідэй таго часу, новых літаратурных форм і напрамкаў. На станаўленне творчасці М. Карыцкага аказалі вялікі ўплыў ідэі Контррэфармацыі і Асветніцтва, ордэна езуітаў, да якога ён належаў, антычнай літаратуры; акрамя гэтага, ён годна працягнуў традыцыі беларускай сатырычнай літаратуры XVII ст. і беларускіх пісьменнікаў-лацiністаў С. Буднага, С. Рысінскага, М. Гусоўскага, Я. Вісліцкага, С. Полацкага.

Літаратура:

1. Парэцкі Я. І. Міхаіл Карыцкі / Я. І. Парэцкі. – Мінск: Універсітэцкае, 1991. – 142 с.

2. Карыцкі М. Песні Камэны / М. Карыцкі; перакл., уступ. слова Н. Жлутко. – Мінск: Маст. Літ., 1990. – 120 с.

3. Славутыя імёны Бацькаўшчыны: Зборнік. Вып. 1./Уклад. У. Гілеп і інш. – Мн., БФК, 2000. – 384 с.

# ПОСЛЕДОВАТЕЛЬНОСТЬ И СПОСОБЫ ПРЕЗЕНТАЦИИ ГРАММАТИЧЕСКОГО МАТЕРИАЛА ПО ЛАТИНСКОМУ ЯЗЫКУ ДЛЯ СТУДЕНТОВ-МЕДИКОВ ВЫСШИХ УЧЕБНЫХ ЗАВЕДЕНИЙ

**Шарова И. В.**

Гродненский государственный медицинский университет
г. Гродно, Республика Беларусь

Для реализации практической цели обучения латинскому языку студентов-медиков высших учебных заведений необходимо решить вопрос о последовательности введения грамматического материала языка.

Последовательность презентации грамматического материала устанавливается с учетом основных критериев: системности грамматических явлений и их сочетаемости. Во внимание принимается и критерий частотности грамматических явлений, а также связь грамматики с лексикой. Остальные критерии учитываются только, если не противоречат основным. Критерий системности определяет порядок введения грамматических явлений внутри всех морфологических категорий. Его реализацию поддерживает сам системный характер латинского языка. Таким образом, лингвистическая

Репозиторий ГрГМУ